**Трамбіцкая В.І.**, *дацэнт*

# ДА ПРАБЛЕМЫ ЗАСВАЕННЯ ІНСТРУМЕНТАЛЬНАГА ФАЛЬКЛОРУ Ў ДЗІЦЯЧЫМ АНСАМБЛІ

Народныя музычныя інструменты і інструментальная музыка, а таксама выканальніцкае майстэрства традыцыйных музыкантаў прыцягваюць сёння вялікую ўвагу не толькі фалькларыстаў, але і кіраўнікоў шматлікіх самадзейных калектываў, якія імкнуцца засвойваць беларускі фальклор. Асэнсаванне фальклору як унікальнай культурнай з'явы патрабуе новых падыходаў да праблемы яго засваення ва ўмовах, адарваных ад натуральнай сферы яго існавання. Пашыраецца імкненне не толькі да знешняга падабенства, але і да глыбокага пранікнення ў сутнасць народна-інструментальнай музыкі ўдзельнікаў аматарскіх мастацкіх калектываў, якія цікавяцца фальклорам. Але, каб па-сапраўднаму яго спасцігнуць, неабходна знайсці шляхі адпаведнага ўключэння музычнага вопыту традыцыйных выканаўцаў у сучасную практыку фальклорных калектываў, і асабліва дзіцячых. Бо чым раней пачынаецца музычнае выхаванне, станаўленне музычнага мыслення, тым больш перспектыўным будзе шлях засваення фальклору, больш значным вынік.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На жаль, педагагічны працэс у дзіцячых калектывах часта пазбаўлены аднаго з важнейшых элементаў народнай інструментальнай традыцыі і яе асноўнага механізму - выканальніцтва. Спосабы выканання на народных інструментах, мастацкі стыль традыцыйных выканаўцаў, якасць і афарбоўка гуку з'яўляліся той прыметай, якая вызначала этнічную і рэгіянальную адметнасць. Асаблівы стыль, манера выканання, характар гукаўтварэння, інтанаванне культываваліся ў традыцыйных народных выканальніцкіх школах, дзе музыкант-настаўнік вучыў усяму гэтаму дзяцей. У педагагічным працэсе ў сучасных фальклорных калектывах гэта ніяк не адлюстравана. Выкананне фальклору практычна не адрозніваецца ад выканання кампазітарскіх твораў пісьмовай традыцыі. Фальклор мае беспісьмовую кантактную форму перадачы, і на гэтай аснове традыцыйная народна-інструментальная музыка існуе толькі ў працэсе выканання. Адпрацаваныя вякамі нормы вуснай народнай творчасці ў гэтым жанры выяўляюцца ў аб'яднаным мастацка-выканальніцкім працэсе, калі музыкант у час выканання стварае кожны раз новы варыянт. Таму важнымі ўмовамі выканальніцтва былі развіццё асаблівага тыпу музычнай памяці, навыкаў валодання цэласнай музычнай формай, спецыфічнага комплексу слыхавых, зрокавых і маторна-рухальных уяўленняў, якія склаліся ў школе народнага выканаль-ніцтва ў выніку вуснага характару музіцыравання, асаблівасцей народных інструментаў і г.д. Гэтыя навыкі не дае вучню распаўсюджаная сёння методыка пісьмовага (праз нотны тэкст) засваення фальклору.

Імправізацыйнае па сваёй сутнасці выкананне народнага музыканта заўсёды было творчай з'явай. Моцна абапіраючыся на мясцовую традыцыю, ён, тым не менш, быў свабодны ў праявах уласнай творчасці. Выканальніцкая і творчая дзейнасць народнага музыканта ўяўляюць адно цэлае, бо часта выкананне і было творчасцю. Навыкі гэтай творчасці, выканальніцкую раскаванасць, свабоду валодання музычным матэрыялам неабходна ўводзіць сёння ў педагагічны працэс у

дзіцячых калектывах. Гэта адпавядае прыродзе фальклору, спрыяе выхаванню ў дзяцей своеасаблівага музычнага мыслення.

Вопытны народны музыкант добра ўсведамляў асаблівасці творчага працэсу станаўлення і развіцця музычнай формы, змяненняў яе ў залежнасці ад сітуацыі ў час выканання. Ад музыканта гэта патрабавала бясспрэчных ведаў і добрых тэхнічных уменняў, таму для яго выхавання неабходнымі былі і спецыяльнае навучанне, і пастаяннае ўдасканаленне. Такім чынам, народна-інструментальнае выканальніцтва з'яўлялася ў пэўным сэнсе прафесійным, і прафесіяналізм гэты садзейнічаў станаўленню выканальніцкіх школ, якія існавалі на Беларусі і плённа выхоўвалі пакаленні нацыянальных музыкантаў.

Такія школы, вядомыя на Палессі, у Заходняй Віцебшчыне, на Гродзеншчыне, існавалі на фундаменце трывалых мясцовых традыцый. Музыкант, якому аддавалі «ў навуку» дзяцей, меў уласную методыку навучання і спалучэння яго з выканальніцтвам, свае патрабаванні да здольнасцей вучня, свой рэпертуар, свае педагагічныя сакрэты. Сістэма гэтая была надзвычай адпрацаванай і жыццяздольнай, таму механізмы яе патрабуюць сёння глыбокага вывучэння і шырокага ўвядзення ў педагагічны працэс у дзіцячых калектывах. Гэта дапаможа па-сапраўднаму глыбока і дасканала адрадзіць народна-інструментальныя традыцыі, дзе працэс навучання быў непарыўна звязаны з працэсам выканання. Акрамя таго, ахопліванне розумам традыцыйнага музычнага выканальніцтва дазволіць аднавіць натуральныя шляхі пераемнасці ў народна-інструментальным мастацтве, а значыць, і ўмовы для яго захавання і развіцця.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ